ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 7 (927) | АЎТОРАК, 22 красавіка 1997 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## СТЫПЕНДЫІ АД ПРАФСАЮЗА

За высокія дасягненні ў вучобе і актыўны ўдзел у рабоце прафсаюзнай арганізацыі Саветам федэрацыі прафсаюзаў рэспублікі ўстаноўлены імянныя стыпендыі для студэнтаў ВНУ. У бягучым семестры іх удастоены 11 чалавек з розных навучальных устаноў Беларусі. Сярод іх -- пяцікурснік фізічнага факультэта нашага універсітэта Пётр Сухоцкі. Памер такой стыпендыі -- дзве мінімальныя заработныя платы.

Імянныя стыпендыі ўстаноўлены таксама абласным камітэтам прафсаюза работнікаў адукацыі і прафкомам студэнтаў ГДУ. Яны назначаны адпаведна другакурсніцы геолага-геаграфічнага факультэта Алене Саўчанка і дзвюм сёстрам -- студэнткам 3-га курса фізічнага факультэта Людміле і Таццяне Сарока.

## ЧЫМ ЗАНЯЦЦА СТУДЭНТУ Ў ВОЛЬНЫ ЧАС?

Гады вучобы маладога чалавека ў ВНУ ці тэхнікуме -- гэта не толькі лекцыі і практычныя заняткі, экзаменацыйныя сесіі. Гэта яшчэ і добрая магчымасць стаць асобай духоўна багатай, усебакова развітай, бо ў вольны ад вучобы час можна знайсці прымяненне сваім талентам, здольнасцям у аб'яднаннях па інтарэсах, клубах розных напрамкаў, творчых калектывах.

Пытанням арганізацыі вольнага часу студэнцкай і навучэнцкай моладзі прысвячаўся праведзены на базе нашага універсітэта рэспубліканскі семінар-нарада старшынь прафкомаў студэнтаў ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. У ім прынялі ўдзел прадстаўнікі 21 ВНУ і 6 тэхнікумаў Гомельшчыны і рэспублікі.

Не выпадкова ГДУ імя Ф.Скарыны стаў месцам правядзення семінара. Яго напрацоўкам у арганізацыі вольнага часу студэнтаў многім можна павучыцца. У гэтым заслуга прафкома студэнтаў і работнікаў культурнага цэнтра, які служыць рэалізацыі маладзёжных ініцыятыў і далейшага ўдасканалення арганізацыі адпачынку моладзі, супрацоўнікаў і выкладчыкаў універсітэта. Дастаткова сказаць, што пры культурным цэнтры працуе 36 клубных аб'яднанняў, 12 творчых калектываў, 4 з якіх носяць ганаровае званне "народны". Двойчы ГДУ праводзіў грандыёзны па сваіх маштабах і значнасці міжнародны фестываль "Арт-сесія".

Удзельнікі семінара змаглі пазнаёміцца больш падрабязна з формамі арганізацыі вольнага часу студэнтаў ГДУ ў час прагляду спецыяльна падрыхтаваных відэаматэрыялаў, з работай санаторыя-прафілакторыя, аздараўленчага цэнтра. Не ў кожнай навучальнай установе ёсць такія падраздзяленні, а таксама студэнцкае кафэ, дзе можна з карысцю адпачыць. Але гэта не азначае, што ў нашым універсітэце няма праблем з арганізацыяй вольнага часу. Сёння яны ва ўсіх агульныя -- недахоп

(ЗАКАНЧЭННЕ НА 2-й стар.)

## АБМЕРКАВАНА НА РЭСПУБЛІКАНСКІМ СЕМІНАРЫ

На базе Рэчыцкага педагагічнага каледжа Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і ўпраўленнем адукацыі Гомельскага аблвыканкома праведзены рэспубліканскі семінар па праблеме "Рэгіянальны каледж у сістэме няспыннай падрыхтоўкі кадраў для Чарнобыльскай зоны". У ім прынялі ўдзел загадчыкі раённых і гарадскіх аддзелаў адукацыі, дырэктары педвучылішчаў і педкаледжаў.

Цэнтральным на парадку дня быў "Круглы стол", за якім абмяркоўвалася вельмі важная задача па падрыхтоўцы педагагічных кадраў для раёнаў, якія пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС. Аб тым, якую ролю ў гэтым накірунку адыгрывае наш універсітэт, гаварыў у сваім выступленні прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце М.М.Воінаў.

## ВЫХАВАННЕ -- СПРАВА ВАЖНАЯ

У мінулую сераду на пасяджэнні прафкома абмяркавана пытанне аб выхаваўчай рабоце ў інтэрнатах універсітэта. Па справаздачах аб выніках праверкі членаў прафкома А.А.Вішанковай, Т.Р.Добшыкавай, А.М.Красновай, В.Л.Мярэжы заслуханы тлумачэнні намеснікаў дэканаў па выхаваўчай рабоце, супрацоўнікаў аддзела выхаваўчай работы.

У пасяджэнні прафкома прыняў удзел і выступіў з абагульненнем станоўчых дасягненняў і пастановак тых задач, якія неабходна вырашаць у бліжэйшы час, прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце М.М.Воінаў. Пасля гэтага было прынята адпаведнае рашэнне.

На пасяджэнні былі разгледжаны таксама некаторыя іншыя пытанні прафсаюзнага жыцця.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці кандыдат эканамічных навук дацэнт кафедры эканамічных тэорый **ЦЫБІНА Алена Пятроўна** ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі і студэнты матэматычнага факультэта горача віншуюць **І.В.Зісельмана, С.І.Жогаль** з кафедры матэматычных праблем кіравання з зацвярджэннем іх БелВАКам у вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук.*

# УЗРАСТАЕ РЭЙТЫНГ ВУЧОНЫХ-АЛГЕБРАІСТАЎ

*РАДКІ З БІЯГРАФІІ.* Віктар Сцяпанавіч Манахаў нарадзіўся ў г.Орску Арэнбургскай вобласці -- зямляк цяперашняга прэм'ер-міністра Расіі В.С.Чарнамырдзіна. Закончыў мясцовы педагагічны інстытут, пасля чаго стаў гамяльчанінам.

***-- Віктар Сцяпанавіч, што прывяло Вас у горад над Сожам?***

-- Яшчэ ў школьныя гады я захапіўся матэматыкай. Яна і вызначыла мой жыццёвы шлях. Па атрыманні вышэйшай адукацыі быў накіраваны ў аспірантуру Гомельскага аддзялення Інстытута матэматыкі АН Беларусі ўжо тады шырока вядомай гомельскай алгебраічнай школы, якую ўзначальваў выдатны матэматык акадэмік С.А.Чуніхін. Маім навуковым кіраўніком стаў адзін з самых таленавітых яго вучняў малады доктар фізіка-матэматычных навук Л.А.Шамяткоў. На той час я быў у яго другім аспірантам. Дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук паспяхова абараніў у 1974 годзе.

*НАВУКОВЫЯ НАБЫТКІ ВУЧОНАГА-АЛГЕБРАІСТА.* Пяру В.С.Манахава належыць 80 навуковых прац. Пры гэтым у яго амаль няма сааўтараў, што цяпер заўважаецца вельмі рэдка. Ён удзельнічаў у шматлікіх алгебраічных сімпозіумах і канферэнцыях, на якіх шмат разоў выступаў з навуковымі дакладамі і заслужыў высокія адзнакі сваіх калег і апанентаў.

В.С.Манахаў узначальваў кафедру алгебры і геаметрыі, навуковы патэнцыял якой самы высокі ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф.Скарыны. У 1992 годзе Віктару Сцяпанавічу было прысвоена вучонае званне прафесара.

*АБАРОНА ДОКТАРСКАЙ ДЫСЕРТАЦЫІ.* Яна праходзіла нядаўна на спецыялізаваным Савеце, створаным пры ГДУ. Тэма дысертацыі прысвечана тэарэтычным пытанням спецыяльнасці "Матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лічбаў".

Вялікую значнасць і навуковую каштоўнасць даследаванняў В.С.Манахава зазначылі ў сваіх знешніх водзывах знакамітыя беларускія алгебраісты акадэмік У.П.Платонаў і член-карэспандэнт АН Беларусі А.Я.Залескі. На бясспрэчную вартасць яго доктарскай дысертацыі ўказалі афіцыйныя апаненты доктары фізіка-матэматычных навук, прафесары: загадчык кафедры алгебры і матэматычнай логікі Яраслаўскага дзяржуніверсітэта Л.С.Казарын, загадчык аддзялення тэорыі груп Інстытута матэматыкі Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук В.Д.Мазураў, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута матэматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Украіны М.С.Чэрнікаў, а таксама апаніруючая арганізацыя -- Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны універсітэт.

Пры абароне дысертацыі ў адрас В.С.Манахава выказаны заслугоўваючыя ўвагі адзнакі і пажаданні членаў спецыялізаванага Савета, алгебраістаў-калег.

Канчатковым вынікам абароны стала аднагалоснае хадайніцтва членаў спецыялізаванага Савета перад Дзяржаўным Вышэйшым Атэстацыйным Камітэтам Рэспублікі Беларусь аб прысуджэнні В.С.Манахаву вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук



*Словы, сказаныя В.С.Манахавым у інтэрв'ю:*

-- За сваю паспяховую навуковую дзейнасць я перш за ўсё ўдзячны майму былому навуковаму кіраўніку, а затым добразычліваму дарадчыку і кансультанту прафесару, члену-карэспандэнту АН Беларусі, акадэміку Беларускай акадэміі адукацыі Л.А.Шамяткову, які ўжо многія гады ўзначальвае Гомельскую алгебраічную школу. На сённяшні дзень сярод яго вучняў -- 7 прафесараў і 27 кандыдатаў навук, у тым ліку і два доктары з далёкага замежжа -- з Кітая і Іарданіі. Вельмі прыемна, што ў гэту кагорту вучоных-алгебраістаў уваходжу і я.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

***На здымку:* доктарскую дысертацыю абараняе прафесар В.С.Манахаў.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

# ЧЫМ ЗАНЯЦЦА СТУДЭНТУ Ў ВОЛЬНЫ ЧАС?

**(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК НА 1-й стар.)**

фінансавых сродкаў. Аб гэтым гаварылася і на пасяджэнні "Круглага стала" семінара, у час якога было заслухана 9 паведамленняў кіраўнікоў студэнцкіх прафкомаў розных навучальных устаноў. У кагосьці вопыт больш багаты, у іншых -- меншы. Ішоў абмен вопытам, думкамі, як у сённяшніх складаных эканамічных умовах захаваць дасягнутыя поспехі ў арганізацыі вольнага часу моладзі, дабіцца новых.

Праграмай семінара прадугледжвалася таксама знаёмства яго ўдзельнікаў з Гомельскім політэхнічным інстытутам, Мазырскім педінстытутам. На базе апошняга прайшоў трэці, заключны дзень семінара.

Вёў семінар загадчык аддзела БРК прафсаюза А.Л.Ліхтаровіч. У яго рабоце прынялі таксама ўдзел старшыня Асацыяцыі прафкомаў студэнтаў ВНУ рэспублікі А.І.Галіца, загадчык абласнога аддзела па культуры, спорту, рабоце сярод моладзі В.А.Раманчук, старшыня абкома прафсаюза работнікаў адукацыі У.Я.Курылаў, яго намеснік Н.І.Аліферэнка, прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце ГДУ М.М.Воінаў, старшыня прафкома Г.І.Варатніцкі.

**Т.НІКАЛАЕВА.**



Абітурыентам -97

# АБ ТЫМ, ЯК ПАСПЯХОВА ВЫТРЫМАЦЬ УСТУПНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ

***Пераважная большасць абітурыентаў паступае ў наш універсітэт з добрымі і выдатнымі адзнакамі ў атэстатах сталасці. Аднак гэта яшчэ не гарантуе поспеху. Многія выпускнікі школ і іншых навучальных устаноў не могуць пацвердзіць свае веды на прыёмных экзаменах. Змяшчаемыя ў сённяшнім нумары нашай газеты рэкамендацыі старшынь прадметных камісій у пэўнай ступені дапамогуць лепшай арыентацыі абітурыентаў у час здачы экзаменаў пры паступленні ў ГДУ.***

***Неабходныя кансультацыі можна таксама атрымаць на адпаведных кафедрах факультэтаў і напярэдадні ўступных экзаменаў.***

## ФІЗІКА

Сёлета, як і ў папярэднія гады, уступны экзамен па фізіцы ў Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны праводзіцца ў вуснай форме. Мэта экзамену -- выявіць якасць ведаў і наяўнасць практычных навыкаў іх выкарыстання пры рашэнні канкрэтных задач. Абітурыенту, які рыхтуецца да экзамену па фізіцы, ды і па іншых вусных дысцыплінах, карысна азнаёміцца з наступнымі правіламі і асаблівасцямі правядзення вуснага экзамену:

1. Пачатак экзамену ў 8 гадзін 20 мінут. Дзень правядзення экзамену і нумар аўдыторыі ўказаны ў раскладзе экзаменаў.

2. Абітурыенты заходзяць у аўдыторыю для здачы экзамену ў парадку чаргі, якую ўстанаўліваюць самі.

3. Абітурыент, які з'явіўся на экзамен, павінен прадставіць экзаменатарам свой экзаменацыйны ліст і дакумент, які засведчвае асобу (пашпарт). Толькі пасля гэтага абітурыент бярэ экзаменацыйны ліст і атрымлівае ў экзаменатара лісты-укладышы для падрыхтоўкі да адказу. Час падрыхтоўкі -- 40 мінут.

4. Заняўшы месца, указанае экзаменатарам, абітурыент абавязаны на кожным лісце-укладышу ўказаць дату правядзення экзамену, нумар экзаменацыйнага білета, нумар экзаменацыйнага ліста, прозвішча, імя і імя па бацьку поўнасцю.

5. Экзаменацыйны білет змяшчае два тэарэтычныя пытанні і ўмовы задачы, якую неабходна рашыць. Пытанні і задачы ў білеце падбіраюцца такім чынам, каб ахапіць розныя раздзелы курса фізікі. Рэдакцыя пытанняў, змешчаных у білеце, паўтарае іх рэдакцыю ў праграме для паступаючых у ВНУ.

6. Адказы на тэарэтычныя пытанні білета абітурыент абавязаны даць у пісьмовай форме на лістах-укладышах на беларускай або рускай мове. У адказе павінны змяшчацца фармуліроўкі азначэнняў фізічных велічынь і фізічных законаў, формулы і іх вывады, графікі, якія ілюструюць абмяркоўваемую фізічную з'яву, і схемы эксперыментаў, калі яны неабходны.

7. Прапанаваная ў білеце задача адносіцца да аднаго з раздзелаў курса фізікі, вызначаных на падставе праграмы па фізіцы для паступаючых у ВНУ і не выходзіць за рамкі патрабаванняў гэтай праграмы. Умоўны пералік раздзелаў праграмы наступны:

*Кінематыка. Асновы дынамікі. Законы захавання ў механіцы.*

*Элементы статыкі. Вадкасці і газы.*

*Асновы малекулярна-кінетычнай тэорыі. Газавыя законы.*

*Цеплавыя з'явы.*

*Электрастатыка.*

*Законы пастаяннага току.*

*Магнітнае поле. Электрамагнітная індукцыя.*

*Хістанні і хвалі.*

*Оптыка.*

*Квантавая фізіка.*

8. Абітурыент рашае задачу на лістах-укладышах, выкарыстоўваючы іх у якасці чарнавіка. Рошаная задача павінна быць перапісана на чысты ліст, змяшчаць кароткія ўмовы, поўнае рашэнне, аналітычны і лічбавы адказы. Для рашэння задач карыстацца толькі адзінкамі сістэмы СІ.

9. Абітурыенту не дазваляецца карыстацца даведнікамі, табліцамі, мікракалькулятарамі і г.д., а таксама прыносіць з сабою чыстыя лісты паперы. Усе неабходныя для рашэння задачы лічбавыя значэнні змешчаны ў яе ўмове.

10. Работа на лістах-укладышах выконваецца шарыкавай або пер'явой ручкай. Колер пасты або чарнілаў -- сіні або чорны.

11. Выходзіць з аўдыторыі ў час правядзення экзамену забараняецца.

12. У выпадку нязгоды абітурыента з адзнакай, у адпаведнасці з правіламі прыёму ўступных экзаменаў у ВНУ, у дзень аб'яўлення адзнакі ён можа падаць апеляцыю ў прыёмную камісію. На апеляцыйнай камісіі ў прысутнасці абітурыента яго работа разглядаецца яшчэ раз. Ніякія дадатковыя тлумачэнні да запісаных адказаў на пытанні і рашэнні задачы апеляцыйнай камісіяй не прымаюцца.

13. Пры няяўцы абітурыента на экзамен па ўважлівай прычыне пытанне аб яго допуску да здачы экзамену ў другі дзень рашаецца прыёмнай камісіяй ГДУ.

## ГЕАГРАФІЯ

Галоўнай асаблівасцю гэтай дысцыпліны з'яўляецца спалучэнне дысцыплін прыродазнаўчага (агульная фізічная геаграфія, фізічная геаграфія Рэспублікі Беларусь, краін садружнасці, а таксама мацерыкоў і частак свету) і грамадскага (эканамічная геаграфія Рэспублікі Беларусь, эканамічная геаграфія замежных краін) цыкла. Пры гэтым вывучэнне гэтых дысцыплін у сярэдняй школе ажыццяўляецца на працягу пяці гадоў. Экзаменацыйныя білеты для прыёму ўступных экзаменаў па геаграфіі складаюцца ў поўнай адпаведнасці з "Праграмай для паступаючых у вышэйшыя навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь" і ўключаюць два пытанні: адно па фізічнай геаграфіі, другое -- па эканамічнай геаграфіі.

Аналіз вынікаў уступных экзаменаў за многія гады дазваляе спыніцца на найбольш слабых месцах у падрыхтоўцы абітурыентаў. У першую чаргу трэба сказаць, што многія абітурыенты, якія выбралі спецыяльнасць "геаграфія", як ні дзіўна, не маюць геаграфічнага мыслення. У адказах адсутнічаюць прычынна-следчыя сувязі паміж кампанентамі прыроднага асяроддзя (рэльефу, клімату, унутраных вод, глеб, расліннасці і жывёльнага свету). У лепшым выпадку абітурыент адказвае на пытанне "дзе", але не адказвае "чаму". Вельмі слаба прагледжваюцца ўзаемасувязі паміж прыродным асяроддзем і тыпам гаспадарчай дзейнасці насельніцтва. Асабліва гэта добра бачна, калі размова ідзе аб тэрыторыі, населеным пункце, дзе жыве абітурыент.

Слабым месцам у адказах абітурыентаў з'яўляецца ўяўленне аб фізіка-геаграфічным раяніраванні, аб прынцыпах выдзялення прыродных абласцей, раёнаў. Не заўсёды раскрываюцца глабальныя і рэгіянальныя экалагічныя праблемы.

Па курсу эканамічнай геаграфіі абітурыенты часта паказваюць поўнае няведанне такіх пытанняў як заканамернасці і прынцыпы, фактары размяшчэння вытворчых сіл, роля прыродна-рэсурснага патэнцыялу ў развіцці і размяшчэнні гаспадаркі, насельніцтва і працоўных рэсурсаў. Імі слаба асвятляюцца пытанні, звязаныя з тэрытарыяльным раздзяленнем працы. Няма дакладнага разумення такіх паняццяў, як "буйны эканамічны раён" і яго асноўныя прыкметы, тэрытарыяльна-вытворчы комплекс, прамысловы вузел.

Асабліва трэба спыніцца на выкарыстанні геаграфічных карт і геаграфічнай наменклатуры. Агульнавядома, што геаграфія не адасоблена ад карты і прадметная камісія кіруецца двума асноўнымі палажэннямі: без карты няма геаграфіі і карта не толькі наглядны дапаможнік, але і ў многіх выпадках з'яўляецца самастойнай крыніцай геаграфічных ведаў. Таму абітурыентам трэба асаблівую ўвагу ўдзяліць рабоце з картай і веданню геаграфічнай наменклатуры.

# АБ ТЫМ, ЯК ПАСПЯХОВА ВЫТРЫМАЦЬ УСТУПНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ

## Абітурыентам -97

## ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ І СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ

Сёлета ўступныя экзамены па гісторыі Беларусі, як і ў папярэднія гады, будуць уяўляць для абітурыентаў пэўныя цяжкасці, нягледзячы на тое, што школы і вучні ў апошні час атрымалі больш грунтоўныя вучэбныя дапаможнікі. Сярод іх можна назваць такія, як "Гісторыя Беларусі. Вучэбны дапаможнік для 10-11 класаў сярэдняй школы", "Гісторыя Беларусі. Пытанні і адказы", "Гісторыя Беларусі. Вучэбны дапаможнік для 9 класаў сярэдняй школы" і інш.

У 1995-1996 г.г. на старонках газет і часопісаў было апублікавана шмат гістарычных першакрыніц, змястоўных і цікавых артыкулаў, нарысаў, даведачнага матэрыялу па розных перыядах гісторыі Беларусі. Асабліва трэба адзначыць тое вялікае значэнне, якое маюць для вывучэння гісторыі нашай дзяржавы "Беларускі гістарычны часопіс", "Беларуская мінуўшчына", на старонках якіх публікуецца разнастайны гістарычны і навукова-метадычны матэрыял. Але ўсё ж, нягледзячы на гэтыя станоўчыя зрухі ў падыходзе да вывучэння гісторыі Беларусі, прадметная камісія ГДУ добра ўяўляе тыя аб"ектыўныя, а часта і суб'ектыўныя цяжкасці, з якімі сутыкаюцца выпускнікі школ пры падрыхтоўцы да ўступных экзаменаў у ВНУ. У гэтым плане не апошнюю ролю адыгрывае той факт, што ў школах завышаюць вучням адзнакі па гісторыі. Нярэдка нават на 2 балы. У выніку асобныя вучні пераацэньваюць свае магчымасці. На гэты істотны недахоп школьнай падрыхтоўкі звярнула ўвагу камісія Прэзідэнта Беларусі на ўступных экзаменах у нашым універсітэце ў 1995 годзе (гл. "Гомельская праўда", 7 лютага 1995 г., арт.Ф.Коршунава "Прэзідэнцкая камісія на экзаменах. Як мы працавалі").

Сёлета абітурыенты будуць здаваць экзамен і па сусветнай гісторыі навейшага часу. Па складанасці засваення гэты прадмет не ўступае гісторыі Беларусі. Асаблівую ўвагу абітурыенты павінны ўдзяліць такім пытанням як прычыны афармлення адміністрацыйна-каманднай сістэмы ў СССР, даць аб'ектыўную ацэнку агульных тэндэнцый сацыяльна-эканамічнага развіцця краін Еўропы і ЗША да другой сусветнай вайны, у перыяд вайны і ва ўмовах пасляваеннага развіцця.

Асаблівую ўвагу трэба таксама ўдзяліць пытанням міжнародных адносін, умець прааналізаваць знешнюю палітыку не толькі вядучых краін свету, але і растлумачыць знешнюю палітыку краін Усходняй Еўропы ў сучасных умовах, у тым ліку і па такому пытанню, як пашырэнне ўплыву НАТА на ўсход.

Абітурыенты павінны арыентавацца па пытаннях развіцця культуры ў навейшы час, звяртаючы самую сур'ёзную ўвагу на такія пытанні як дэмакратызм і гуманізм культуры, праблемы маладзёжнай культуры ў 60-90 гады.

Абітурыентам неабходна нагадаць, што экзамен па гісторыі Беларусі даволі складаны з-за вялікага аб'ёму матэрыялу. Устойлівыя веды (і гэта пацвярджаюць уступныя экзамены мінулага года) паказваюць, як правіла, тыя абітурыенты, якія і ў школе атрымоўвалі заслужаныя адзнакі, а не завышаныя. Прыёмная камісія, жадаючы аказаць у нейкай меры дапамогу абітурыентам пры падрыхтоўцы да ўступных экзаменаў, прапаноўвае звярнуць ім сваю ўвагу на некаторыя праблемы з тым, каб яны ўяснілі найбольш істотныя асаблівасці гістарычнага працэсу Беларусі. У першую чаргу гэта, як і ў папярэднія гады, шэраг праблем, звязаных з узнікненнем і развіццём дзяржаўнасці беларускага народа. Асаблівую ўвагу абітурыентам неабходна звярнуць на перадумовы беларускага этнасу, сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця Полацкага, Тураўскага і іншых княстваў у перыяд утварэння раннефеадальнай дзяржаўнасці на Беларусі, утварэнне Вялікага княства Літоўскага і яго барацьбу за захаванне незалежнасці дзяржавы.

Аналізуючы адказы абітурыентаў на ўступных экзаменах па гісторыі Беларусі ў мінулым годзе, неабходна адзначыць слабыя веды па сацыяльна-эканамічных пытаннях развіцця Беларусі, няўменне арыентавацца ў праблемах развіцця культуры Беларусі, ва ўнутрыпалітычных канфліктах, слабае веданне храналогіі гісторыі Беларусі. Таму на гэтыя пытанні абітурыенты павінны звярнуць асаблівую ўвагу. Тое ж самае датычыцца і спецыфікі развіцця капіталістычнай гаспадаркі, у асаблівасці праблем, звязаных з правядзеннем рэформы 1861 г., грамадска-палітычным рухам другой паловы мінулага стагоддзя (паўстанне 1863 г., рух народнікаў, выступленне сялян і рабочых, узнікненне палітычных арганізацый і партый), фарміраваннем нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа і г.д.

Складаную праблему для абітурыентаў прадстаўляе і перыяд развіцця Беларусі ва ўмовах сацыялізма і фарміравання таталітарнага рэжыму. Абітурыенты павінны дакладна тлумачыць прычыны і вынікі дэфармацыі грамадска-палітычнага жыцця пры сацыялістычным будаўніцтве, даць аб'ектыўную ацэнку дэмакратызацыі грамадскага жыцця ва ўмовах набыцця Беларуссю дзяржаўнай самастойнасці.

На гэтую акалічнасць указала і камісія ў 1996 годзе.

## ХІМІЯ

Кожны білет па хіміі змяшчае чатыры заданні: адно -- па агульнай і неарганічнай хіміі, другое -- па арганічнай хіміі, у якасці трэцяга задання прапануюцца розныя колькасныя задачы, чацвёртае заданне змяшчае ланцужкі хімічных пераўтварэнняў.

Адказы на пытанні павінны быць па магчымасці поўнымі і ў абавязковым парадку суправаджацца напісаннем адпаведных хімічных формулаў і ўраўненняў рэакцый.

На ўступных экзаменах паступаючы ва універсітэт павінен паказаць веданне агульных тэарэтычных палажэнняў хіміі як адной з асноўных прыродазнаўчых навук; умець прымяняць іх пры разглядзе асобных класаў рэчываў і канкрэтных злучэнняў; ведаць уласцівасці важнейшых рэчываў, якія прымяняюцца ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, быце; разумець навуковыя прынцыпы важнейшых хімічных вытворчасцей (не заглыбляючыся ў дэталі хімічнай тэхналогіі), рашаць тыповыя нескладаныя задачы. На экзамене можна карыстацца табліцамі: "Перыядычная сістэма хімічных элементаў Мендзялеева", "Растваральнасць асноў, кіслот і соляў у вадзе", "Электрахімічны рад напружанняў металаў".

Прывядзем найбольш характэрныя памылкі, якія дапускаюць многія абітурыенты на ўступным экзамене па хіміі. Многія з іх не ўмеюць правільна пісаць эмпірычныя і структурныя формулы злучэнняў і ўраўненні прасцейшых хімічных рэакцый. Не ўсе ясна ўяўляюць, што такое ступень акіслення, як вызначыць яе велічыню зыходзячы з формулы злучэння, атаясамліваюць ступень акіслення і валентнасць элемента. Нярэдка дапускаюцца памылкі пры напісанні поўных ураўненняў рэакцый, ураўненняў ступеньчатай дысацыяцыі кіслот і асноў.

Значная колькасць абітурыентаў слаба ўяўляе сутнасць акісляльна-аднаўленчых рэакцый, асаблівасці ўзаемадзеяння сернай і азотнай кіслот з металамі, не ўмеюць аперыраваць хімічнымі паняццямі пры тлумачэнні хімічных з'яў, маюць слабыя веды па асобных уласцівасцях хімічных элементаў і іх злучэнняў, не ўмеюць карыстацца хімічнымі велічынямі пры разліках па хімічных ураўненнях.

Пры тлумачэнні хімічных уласцівасцей арганічных рэчываў часта спасылаюцца пераважна на класічную тэорыю фізічнай будовы і прымяняюць малекулярныя формулы, вельмі рэдка выкарыстоўваючы пры адказах электронныя ўяўленні і структурныя формулы злучэнняў. Не заўсёды здавальняюча тлумачыцца ўзаемнае ўздзеянне атамаў у малекулах арганічных злучэнняў.

Не ўсе абітурыенты могуць растлумачыць залежнасць уласцівасцей розных арганічных злучэнняў ад наяўнасці характэрных функцыянальных груп.

Агульны сур'ёзны недахоп большасці абітурыентаў на экзамене па хіміі -- адсутнасць практычных навыкаў, а іншы раз і поўная бездапаможнасць у рашэнні разліковых задач.



## МАТЭМАТЫКА

Пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці абітурыенты здаюць або два экзамены па матэматыцы (пісьмова і вусна) або адзін (вусна).

Пісьмовы экзамен па матэматыцы праводзіцца ў выглядзе кантрольнай работы. Звычайна абітурыентам прапануюцца два варыянты экзаменацыйнага задання (варыянт для кожнага канкрэтнага абітурыента ўказваецца яму членамі прыёмнай прадметнай камісіі). У кожным з варыянтаў змешчана, як правіла, пяць задач па ўсіх раздзелах школьнага курса матэматыкі. Сярод задач, якія традыцыйна прапануюцца на пісьмовым экзамене, можна адзначыць наступныя: геаметрычныя (стэрэаметрычныя) задачы; задачы, якія патрабуюць рашэння алгебраічных (трыганаметрычных, лагарыфмічных, паказальных) ураўненняў; задачы, якія патрабуюць рашэння сістэм ураўненняў або няроўнасцей; задачы на знаходжанне мінімальнага (максімальнага) значэння.

Пісьмовая работа ацэньваецца па чатырохбальнай сістэме. Адзнака "пяць" ставіцца за работу, у якой без памылак выкананы ўсе заданні. Іншыя станоўчыя адзнакі абітурыент атрымлівае за адпаведную колькасць правільна і поўна рошаных задач. Адзнака "два" ставіцца, калі колькасць памылак пераўзыходзіць норму, пры якой можа быць выстаўлена станоўчая адзнака.

На экзамене абітурыент атрымлівае тытульны ліст і ліст-укладыш (чарнавік і чыставік). Чарнавыя рашэнні задач запісваюцца ў чарнавік, затым рашэнні пераносяцца ў чыставік. Задача лічыцца рошанай, калі ў чыставіку прыведзена яе поўнае правільнае рашэнне з адказам. Калі на перанос рашэння з чарнавіка ў чыставік не хапае часу, то трэба ўказаць, што рашэнне задачы знаходзіцца ў чарнавіку. У гэтым выпадку прадметная камісія разглядае рашэнне данага задання, запісанага ў чарнавіку.

На экзамен не дазваляецца прыносіць мікракалькулятары, кнігі, даведнікі, табліцы, а таксама чыстыя лісты паперы. Пісаць і чарціць трэба толькі ручкай з сінімі чарніламі або шарыкавай ручкай з сіняй пастай.

Для рашэння задач абітурыенту прадастаўляюцца чатыры астранамічныя гадзіны.

Аналіз экзаменацыйных работ мінулых гадоў паказвае, што найбольшую колькасць памылак абітурыенты дапускаюць пры рашэнні стэрэаметрычных задач (няўменне будаваць чарцёж, неабгрунтаванасць пабудоў і вывадаў), пры пераўтварэнні трыганаметрычных, лагарыфмічных і паказальных выражэнняў. Многія памылкі абумоўлены таксама няўменнем адкінуць лішнія рашэнні і выбраць правільны адказ.

Пры правядзенні вуснага экзамену па матэматыцы абітурыенту прапануецца выбраць білет, у якім змешчаны два тэарэтычныя пытанні (па алгебры і геаметрыі) і задача. Прапануемыя пытанні (як і звесткі, неабходныя для рашэння задач пісьмовага экзамену) не выходзяць за межы школьнай праграмы па матэматыцы. Гэтыя пытанні можна знайсці ў даведніку для паступаючых у вышэйшыя навучальныя ўстановы рэспублікі.

Абітурыентам выдаюцца лісты-укладышы, у якіх яны павінны запісаць адказы на тэарэтычныя пытанні і прывесці рашэнне задачы. Гэтыя лісты затым могуць быць выкарыстаны пры разглежданні заяў абітурыентаў на апеляцыйнай камісіі.

Крытэрыі выстаўлення адзнак на вусным экзамене аналагічныя прымяняемым на пісьмовым экзамене.

Аналіз правядзення вуснага экзамену па матэматыцы паказвае, што найбольш часта сустракаюцца наступныя памылкі: абітурыенты блытаюць азначэнні і ўласцівасці тых або іншых паняццяў, не праяўляюць дакладнасці пры азначэнні асноўных функцый і пабудовы іх графікаў, выяўляюць поўнае неразуменне паняцця модуля.

## ЗАМЕЖНАЯ МОВА

Уступны экзамен па замежнай мове будуць здаваць абітурыенты, якія выбяруць для сябе спецыяльнасці: "Правазнаўства", "Гісторыя з правам выкладання англійскай і нямецкай моў", "Геаграфія з правам выкладання англійскай і нямецкай моў", "Беларуская мова і літаратура з правам выкладання англійскай мовы", "Гісторыя", "Геаграфія".

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на спецыялізацыі, якія даюць права выкладання англійскай і нямецкай моў. Будучыя спецыялісты, вам давядзецца жыць і працаваць ва ўмовах рыначнай эканомікі! Магчыма, дзякуючы спецыялізацыі ў замежнай мове, якую можаце атрымаць разам з асноўнай спецыяльнасцю, вы знойдзеце сабе больш дастойную і выгадную сферу прымянення ў народнай гаспадарцы. А можа атрымацца і так, што гэтая другая спецыялізацыя стане для кагосьці першай і асноўнай! Ужо ў наш час мы сутыкаемся з усё ўзрастаючай патрэбай у спецыялістах, якія валодаюць замежнай мовай.

У працэсе чытання экзаменацыйнага тэксту і вуснай размовы выкладчыкі правераць вашы веды правілаў чытання і асноў граматыкі, валоданне лексічным мінімумам і навыкамі вымаўлення.

Паступаючым будуць прапанаваны адапціраваныя тэксты з мастацкай і навукова-папулярнай літаратуры, пабудаваныя на тыповых фразах і граматычным матэрыяле школьнага мінімуму. Колькасць незнаёмых слоў не будзе перавышаць 6-8%. Пры перакладзе дазваляецца карыстацца слоўнікам. Разуменне прачытанага правяраецца выбарачным перакладам, шляхам адказу на пытанні экзаменатараў і самастойнай пастаноўкай пытанняў у пісьмовай форме.

Адно з пытанняў білета прадугледжвае размову паміж абітурыентам і экзаменатарам у межах вусных тэм, азначаных праграмай сярэдняй школы. У гэтым годзе на экзамен выносяцца наступныя тэмы:

1. *Аб сабе і сваёй сям'і.*
2. *Мой сябар (сяброўка).*
3. *Мая кватэра (дом).*
4. *Мая школа.*
5. *Мой працоўны дзень.*
6. *Мае захапленні. Мой вольны час.*
7. *Мой любімы прадмет.*
8. *Спорт у маім жыцці.*
9. *Мой любімы час года.*
10. *Мае ўражанні ад наведвання кінатэатра, выставы, канцэрта.*
11. *Мой любімы пісьменнік.*
12. *Мая будучая прафесія.*
13. *Мой родны горад (вёска).*
14. *Рэспубліка, у якой я жыву.*
15. *Мінск -- сталіца Рэспублікі Беларусь.*
16. *Выдатныя людзі Беларусі.*
17. *Праблемы экалогіі.*
18. *Геаграфічнае становішча краіны вывучаемай мовы.*
19. *Выдатныя мясціны краіны вывучаемай мовы.*
20. *Што я ведаю аб краіне вывучаемай мовы.*

Абітурыенты павінны разумець замежную мову ў непасрэднай гутарцы і ў фоназапісе. Разуменне мовы на слых будзе праверана праз заданні да аўдытыўнага тэксту. Працягласць гучання такога тэксту -- да 2 хвілін. Яны маюць фабулу і змяшчаюць да 4% нявывучаных слоў, даступных для разумення на аснове здагадкі, пры даўжыні фраз да 10 слоў.

Аўдыётэкст будзе ўваходзіць як асобнае заданне ў экзаменацыйныя білеты спецыяльнасцей "Англійская мова", "Нямецкая мова", "Геаграфія з правам выкладання англійскай і нямецкай моў", "Гісторыя з правам выкладання англійскай і нямецкай моў", "Беларуская мова і літаратура з правам выкладання англійскай мовы".

Для абітурыентаў, паступаючых на спецыяльнасці "Правазнаўства", "Гісторыя" і "Геаграфія" дзённай і завочнай форм навучання, спецыяльных заданняў на аўдзіраванне не прадугледжваецца.

Прадугледжаны таксама спецыяльныя заданні, якія правяраюць веды лексіка-граматычнага матэрыялу.

Выкладчыкі нямецкай мовы прапануюць звярнуць увагу на дакладнасць вымаўлення складаных слоў, якіх у нямецкай мове шмат. Трэба бачыць межы паміж кампанентамі складаных слоў, што будзе сведчыць аб разуменні значэння слова ў цэлым.

На экзамене па англійскай мове часцей робяць памылкі ва ўжыванні і перакладзе часовых форм дзеяслова, дрэнна распазнаюць і разумеюць формы герундзія прыслоўя і складанага дапаўнення з інфінітывам. Не звяртаюць увагу на прадуктыўныя афіксы англійскай мовы, блытаюць часціны мовы слоў, утвораных ад вядомых каранёў.

## Абітурыентам -97

# АБ ТЫМ, ЯК ПАСПЯХОВА

## МОВА І ЛІТАРАТУРА

Кожны адукаваны чалавек павінен добра ведаць і валодаць мовай, бо гэта паказчык яго агульнай культуры. Менавіта па гэтай прычыне абітурыенты ўсіх спецыяльнасцей будуць здаваць экзамен па беларускай (або рускай) мове і літаратуры ў вуснай або пісьмовай форме.

Памылкі абітурыентаў і недахопы іх сачыненняў даволі тыповыя: няўменне даць слушны адказ на адпаведную тэму (адсюль -- або пераказ зместу твораў мастацкай літаратуры, або адказ па схеме), слабае веданне тэкстаў літаратурных твораў, якія вывучаюцца ў школе, няўменне раскрыць тэму сачынення. Даволі часта назіраецца адсутнасць канкрэтнасці ў сачыненнях на так званыя вольныя тэмы. Часцей за ўсё гэта разважанні агульнага плана, нярэдка рытарычныя, у якіх няма сапраўдных ведаў матэрыялу мастацкіх твораў, няма арганізацыі думкі ў пісьмовым выказванні і доказу сваёй пазіцыі.

У некаторых выпадках гэта можа быць правільны, але няпоўны адказ на тэму, недастаткова мэтанакіравана выкарыстоўваецца тэкст, робяцца некаторыя фактычныя памылкі.

Даволі часта сустракаюцца арфаграфічныя і пунктуацыйныя памылкі: на правапіс галосных пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных, правапіс Й І Ў, правапіс зычных Д -- ДЗ, Т -- Ц, на ўжыванне працяжніка паміж галоўнымі членамі сказа, на адасабленне прыдатка, дзеепрыслоўных і дзеепрыметнікавых словазлучэнняў, параўнальных зваротаў са злучнікам "ЯК". Многія абітурыенты не адрозніваюць складаны сказ ад простага з аднароднымі членамі, не ведаюць правілаў адасаблення даданых членаў сказа.

Кожнаму абітурыенту, які будзе здаваць пісьмовы экзамен па мове і літаратуры, неабходна ведаць наступныя патрабаванні да сачынення: 1) трэба правільна зразумець пытанне, што знаходзіцца ў фармуліроўцы тэмы, і даць на яго разгорнуты аргументаваны адказ; 2) паказаць дакладнае веданне тэксту аналізуемага твора і неабходных тэарэтычна-літаратурных паняццяў; 3) умець аналізаваць не толькі змест, але і мастацкую форму твора; 4) галоўная думка сачынення павінна развівацца па плану (але сам план пісаць неабавязкова).

Упрыгожваннем сачынення можа стаць эпіграф. Аднак ён павінен быць дакладным і перадаваць асноўную думку сачынення. У якасці эпіграфа можна выкарыстоўваць вершаваныя радкі выдатных паэтаў, выказванні вядомых пісьменнікаў, дзеячоў мастацтва і навукі, філосафаў.

Абітурыент павінен паказаць арфаграфічную і пунктуацыйную пісьменнасць, уменне карыстацца рознымі маўленчымі зваротамі і вобразнымі сродкамі мовы, уменне дакладна і да месца цытаваць, выкарыстоўваць лексіку і фразеалогію роднай мовы. Недапушчальны ў сачыненні агульныя фразы, парушэнне паслядоўнасці пераказу, няправільна пабудаваныя сінтаксічныя канструкцыі.

Для таго, каб правільна ацаніць сачыненне, экзаменацыйная камісія па мове і літаратуры кіруецца існуючымі школьнымі нормамі ацэнак. Сачыненне пішацца на працягу чатырох астранамічных гадзін.

Для многіх абітурыентаў будзе цікава ведаць некаторыя тэмы сачыненняў па беларускай і рускай мове і літаратуры, якія прапаноўваліся ў апошнія гады. Сярод іх можна назваць: "Слава Францыска Скарыны не ведае межаў", "Ф.Багушэвіч -- барацьбіт за росквіт роднай мовы і літаратуры", "Тэма бацькаўшчыны ў рамане Я.Брыля "Птушкі і гнёзды", "Палеская хроніка -- энцыклапедыя жыцця беларускага сялянства 20-х гадоў", "Мае любімыя старонкі сучаснай беларускай паэзіі", "Проблема творчества и судьбы художника в романе М.А.Булгакова "Мастер и Маргарита", "Отражение противоречий русской жизни в комедии А.С.Грибоедова "Горе от ума", "Тема Родины в поэзии С.Есенина", "Мои представления о будущей профессии" і інш.

На вусным экзамене па мове і літаратуры абітурыенту прапануецца білет, які складаецца з трох пытанняў: два з іх тэарэтычныя (адно па літаратуры, другое па мове), а трэцяе -- практычнае (часцей за ўсё граматычны разбор сказа). Кожны абітурыент атрымлівае спецыяльны экзаменацыйны ліст і рыхтуе адказ на працягу 40 хвілін. Лічыцца абавязковым, каб кожны паступаючы падрабязна або тэзісна запісаў адказ на кожнае пытанне. Акрамя таго, для абітурыентаў філалагічнага факультэта прапануецца дадатковае вуснае выказванне. Яго мэта -- выявіць уменне абітурыентаў правільна і прыгожа гаварыць, выказваць свае думкі. Пералік выказванняў змешчаны ў даведніку для паступаючых у ВНУ.

Веданне тэксту канкрэтных літаратурных твораў, уяўленне аб месцы творчасці пісьменніка ў развіцці літаратуры і грамадства, уменне аналізаваць і абагульняць, выразна чытаць і ацэньваць мастацкія творы, валодаць маўленнем, словам -- вось асноўныя якасці вуснага адказу. Акрамя гэтага, вусны адказ, як і сачыненне, павінен быць лагічным, паслядоўным, аргументаваным, дакладным, вобразным і пісьменным. Вусны адказ таксама прадугледжвае чытанне вершаў на памяць.

Абітурыенты часцей за ўсё вызначаюць тэму, ідэю мастацкіх твораў, характарызуюць асноўных герояў. Але вызначыць асаблівасці кампазіцыі, стыль твора для многіх даволі цяжка. На вусным экзамене нельга разважаць увогуле аб творы, не ўлічваючы характару пытання ў білеце. У адказах нярэдка назіраецца не толькі адсутнасць ведання тэксту, але і імкненне зрабіць замену канкрэтнага на агульныя фразы і меркаванні.

Паступаючыя павінны добра ведаць мастацкія выяўленчыя і вобразныя сродкі, асаблівасці розных літаратурных жанраў, характэрныя рысы лірыкі, прозы і драматургіі як асноўных родаў літаратуры, не сустракаць цяжкасцей у разборы слова па саставу пры словаўтваральным і фанетычным разборы, марфалагічным і сінтаксічным аналізе сказаў.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на веданне не толькі твораў класічнай беларускай і рускай літаратуры, але і сучасных паэтаў і празаікаў. Аналіз кожнага літаратурнага твора неабходна рабіць зыходзячы з патрабаванняў нашага часу і дасягненняў сучаснай літаратуразнаўчай думкі.

## БІЯЛОГІЯ

Уступныя экзамены па біялогіі ў вуснай форме будуць здаваць абітурыенты, якія паступаюць на біялагічны факультэт і факультэт фізічнай культуры і спорту стацыянарнай і завочнай форм навучання на спецыяльнасць "Псіхалогія".

На ўступных экзаменах па біялогіі абітурыенты павінны паказаць глыбокія і ўсебаковыя веды па агульных і прыватных пытаннях, ведаць фактычны матэрыял у аб'ёме праграмы сярэдняй школы, асаблівасці мясцовай флоры, фауны і экалогіі.

Экзамен па біялогіі ўключае раздзелы батанікі, заалогіі, анатоміі і фізіялогіі чалавека, генетыкі, прыродакарыстання, структуры і функцыяніравання біясферы, эвалюцыі экалогіі, а таксама агульнай біялогіі.

Білеты складаюцца з трох тэарэтычных пытанняў, выбраных з розных раздзелаў біялогіі.

Як сведчыць здача экзаменаў у мінулыя гады, абітурыенты даюць найбольш грунтоўныя адказы на пытанні батанікі, анатоміі, заалогіі, гігіены чалавека ў тых выпадках, якія тычацца апісальнага характару матэрыялу. Слаба ж адказваюць на пытанні па агульнай біялогіі, генетыцы, эвалюцыйнага вучэння, недастаткова дакладна арыентуюцца па асновах экалогіі. Часта адказы носяць павярхоўны характар і не раскрываюць сутнасці пытанняў.

Многім абітурыентам цяжка звязаць тэарэтычныя веды з практыкай сельскай, лясной і прамысловай вытворчасці, а таксама яны не могуць дакладна сфармуляваць тыя або іншыя паняцці і азначэнні.

Пэўныя цяжкасці адзначаюцца пры напісанні некаторых ураўненняў, прывядзенні дат жыцця і дзейнасці вядомых вучоных.

Частка абітурыентаў не можа паслядоўна выкладаць свае веды, звязаць іх у эвалюцыйным аспекце, хаця разам з тым яны валодаюць фактычным матэрыялам.



# ВЫТРЫМАЦЬ УСТУПНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ

## ПА СПЕЦПРАДМЕТУ НА ФАКУЛЬТЭЦЕ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

Асноўным і зыходным палажэннем уступных экзаменаў па спецпрадмету з'яўляецца вызначэнне ўзроўню агульнафізічнай і спартыўнай падрыхтаванасці абітурыентаў. Экзамены па спецпрадмету на факультэце фізічнай культуры ў гэтым годзе па дзённай форме навучання прадугледжаны на 2 аддзяленні -- спартыўнае і педагагічнае. На спартыўнае аддзяленне прымаюцца абітурыенты па наступных спецыялізацыях (відах спорту): веславанню на байдарках і каноэ; гімнастыцы спартыўнай (у тым ліку акрабатыцы, скачках на батуце, мастацкай гімнастыцы; спартыўных гульнях (баскетболу, валейболу, гандболу, футболу); лёгкай атлетыцы; плаванню; спартыўнай барацьбе (вольнай, грэка-рымскай, дзюдо і самба). На дадзеныя спецыялізацыі прымаюцца юнакі і дзяўчаты, мужчыны і жанчыны.

Абітурыенты, якія паступаюць на спартыўнае аддзяленне факультэта фізічнай культуры, першым здаюць пазаконкурсны экзамен па плаванню (таб.1), для спецыялізацыі "плаванне" пазаконкурсным экзаменам з'яўляецца лёгкая атлетыка. Далей абітурыенты спартыўнага аддзялення здаюць экзамен па выбранаму віду спорту, дзе прадугледжаны нарматывы, адпавядаючыя класіфікацыйным праграмам кожнага з пералічаных відаў спорту.

**Табліца 1.**

ПЛАВАННЕ (пазаконкурсны экзамен для спартыўнага аддзялення). Нарматывы для паступаючых на ўсе прадугледжаныя правіламі прыёму спецыялізацыі, акрамя спецыялізацыі "плаванне".

| № | Практыкаванне | адзнака | | |
|---|---|---|---|---|
| | | пяць | чатыры | тры |
| | мужчыны | | | |
| 1. | Плаванне 100м/мін,сек (вольны стыль) | 1.32,0 | 1.47,0 | без уліку часу |
| 2. | Брас 100м/мін,сек | 1.45,0 | 2.00,0 | без уліку часу |
| 3. | Кроль на спіне 100м | 1.42,5 | 1.57,5 | без уліку часу |
| | жанчыны | | | |
| 1. | Плаванне 100м/мін,сек (вольны стыль) | 1.38,0 | 1.53,0 | без уліку часу |
| 2. | Брас 100м/мін,сек | 2.03,0 | 2.18,0 | без уліку часу |
| 3. | Кроль на спіне 100м /мін,сек/ | 1.53,0 | 2.08,0 | без уліку часу |

Абітурыенты, якія паступаюць на педагагічнае аддзяленне, першым таксама здаюць пазаконкурсны экзамен па плаванню, а затым экзамен па спецфізпадрыхтоўцы. Экзамен па спецфізпадрыхтоўцы, як і ў мінулым годзе, уключае нарматывы і патрабаванні спартыўнага шматбор'я, у якім прадугледжана выкананне чатырох абавязковых відаў фізічных практыкаванняў у адпаведнасці з дзейнічаючымі правіламі спаборніцтва: бег 100 м, бег 1000 м, кіданне гранаты, падцягванне на перакладзіне ( мужчыны), згібанне і разгібанне рук ва ўпоры лежачы (жанчыны).

Вынік кожнага віду фізічных практыкаванняў ацэньваецца ў заліковых балах /гл.табліцу 2/. У табліцы таксама паказаны нарматывы і патрабаванні па плаванню. Дыстанцыю можна праплыць адным з існуючых стыляў плавання, прадугледжаных спартыўнай класіфікацыяй.

Неабходна адзначыць, што выкананне любога спартыўнага нарматыву чатырохбор'я ніжэй заліковага ацэньваецца двума /"2"/ баламі, якія не з'яўляюцца заліковымі і не ўваходзяць у агульную суму бальнай адзнакі за экзамен.

Такім чынам, адзнака па спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы складаецца з сумы вынікаў толькі заліковых балаў, набраных абітурыентам у спартыўным шматбор'і:

ад 18 да 20 балаў -- 5 /выдатна/;
ад 14 да 17 балаў -- 4 /добра/;
ад 10 да 13 балаў -- 3 /здавальняюча/.

Абітурыентам неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на плаванне. Так, аналіз вынікаў мінулых гадоў паказвае, што абітурыенты ў асноўным выбіраюць вольны стыль і, такім чынам, не заўсёды паказваюць свае здольнасці ў вывучаных імі стылях плавання. Таму выдзяленне экзамену па плаванню зроблена з мэтай павышэння як агульнага ўзроўню падрыхтаванасці па гэтай дысцыпліне, так і вызначэння эфектыўных спосабаў і стыляў плавання абітурыентамі.

Найбольшыя цяжкасці ў авалодванні нарматывамі і патрабаваннямі па спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы адчуваюць абітурыенты, якія дрэнна валодаюць асноўнымі фізічнымі якасцямі -- сілай, хуткасцю, вынослівасцю, спрытнасцю. Гэта ў першую чаргу нарматывы па бегу на 1000 м, кіданню гранаты, гімнастычных практыкаваннях. У сувязі з гэтым нагадаем, што ў школьнай праграме /XI клас/ задачы па ўдасканаленню фізічных якасцей прадугледжваюць развіццё сілы тулава, хуткасна-сілавых якасцей, сілы рук, сілавой вынослівасці і г.д. Акрамя таго, фізічны стан не абмяжоўваецца толькі названымі фізічнымі якасцямі. Фізічнае развіццё і ўзровень працаздольнасці арганізма, яго аднаўляльнасць пасля нагрузкі -- гэта не менш важна для абітурыента. Паспяхова засвойваць вучэбную праграму на факультэце фізічнай культуры могуць, як правіла, тыя студэнты, якія маюць добры фізічны стан, рознабаковую фізічную падрыхтоўку, тэарэтычныя веды і патрэбу ў сістэматычных занятках фізічнымі практыкаваннямі.

**Табліца 2.**

| Экзамены | Узрост | Нарматыўныя патрабаванні і заліковыя балы | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | мужчыны | | | жанчыны | | |
| СПЕЦФІЗПАДРЫХТОЎКА | | 5 | 4 | 3 | 5 | 4 | 3 |
| Лёгкая атлетыка: | | | | | | | |
| 1. Бег 100м /сек/ | 17-29 | 12.6 | 13.1 | 13.6 | 14.5 | 15.5 | 16.5 |
| | 30 і болей | 13.0 | 13.5 | 14.0 | 15.0 | 16.0 | 17.0 |
| 2. Бег 1000м /мін,сек/ | 17-29 | 3.05 | 3.10 | 3.20 | 3.52 | 4.10 | 4.30 |
| | 30 і болей | 3.15 | 3.25 | 3.35 | 4.10 | 4.30 | 5.00 |
| 3. Кіданне гранаты /м/ | 17-29 | 48.0 | 44.0 | 38.0 | 32.0 | 27.0 | 22.0 |
| | 30 і болей | 45.0 | 41.0 | 35.0 | 27.0 | 22.0 | 18.0 |
| Гімнастыка: | мужчыны | | | | | | |
| падцягванне ў вісе на перакладзіне хватам зверху | 17-29 | 15 | 12 | 8 | - | - | - |
| | 30 і болей | 12 | 9 | 6 | - | - | - |
| | жанчыны | | | | | | |
| згібанне і разгібанне рук ва ўпоры лежачы /згібанне рук не менш 90°, колькасць разоў/ | 17-29 | - | - | - | 28 | 22 | 14 |
| | 30 і болей | - | - | - | 22 | 18 | 11 |
| Плаванне 100м /мін, сек/ вольны стыль | 17-29 | 1.32 | 1.47 | 2.02 | 1.38 | 1.53 | 2.08 |
| | 30 і болей | 1.42 | 1.57 | 2.12 | 1.48 | 2.03 | 2.18 |
| брас | 17-29 | 1.45 | 2.00 | 2.15 | 2.03 | 2.18 | 2.33 |
| | 30 і болей | 1.55 | 2.10 | 2.25 | 2.13 | 2.28 | 2.43 |
| кроль на спіне | 17-29 | 1.45 | 2.00 | 2.15 | 1.53 | 2.08 | 2.23 |
| | 30 і болей | 1.55 | 2.10 | 2.25 | 2.03 | 2.18 | 2.33 |

**Роздум пасля прэм'еры**

# "АПОШНІ ЛІСТ"?

Ва універсітэце прайшлі Дні кафедры англійскай мовы. Вялікім сюрпрызам на іх стала прэм"ера спектакля па матывах апавядання О.Генры "Апошні ліст". Гэта быў незвычайны спектакль. Яго паставілі студэнты гісторыка-юрыдычнага факультэта, і ішоў ён на англійскай мове.

Пачынаючыя акцёры Д.Малахаў -- выканаўца ролі мастака О.Бермана (ён жа рэжысёр-пастаноўшчык), В.Савасценка -- выканаўца ролі Сью, маладой мастачкі, Т.Смолава -- Джонсі, сяброўка Сью, А.Кражаў -- доктар, адказны за дэкарацыі В.Фурман і Р.А.Карпаў -- гукарэжысёр і кампазітар (адзіны выкладчык, які дапамагаў студэнтам ставіць спектакль) проста і чулліва расказалі вядомую гісторыю, напісаную амерыканскім пісьменнікам. Хто ведае гэты твор, мог па вартасці ацаніць трактоўку маладога калектыву, які ўпершыню выйшаў на сцэну і адразу з такім сур"ёзным спектаклем. У яго канву арганічна ўпляліся санеты і ўрыўкі з трагедыі "Рамэа і Джульета" геніяльнага англійскага драматурга В.Шэкспіра, што стала несумненнай знаходкай пачынаючага рэжысёра.

Сваімі ўражаннямі ад спектакля са мной падзяліліся госці, якія прыехалі з Англіі: "Гэта вельмі цудоўна, мы не чакалі, што ўбачым такое. У нас таксама ёсць студэнцкія трупы, у нашых студэнтаў лепшыя апаратура і дэкарацыі, але ігра вашых акцёраў уразіла нас сваёй насычанасцю і пачуццямі. У нашых вачах стаялі слёзы, калі мы глядзелі на старога мастака, які стварае свой лепшы твор -- апошні ліст, выратоўваючы жыццё маладой дзяўчыны. Вашы студэнты размаўлялі на англійскай мове так проста, так натуральна, што мы былі здзіўлены."

Я пацікавілася ў гасцей, як у іх абстаяць справы са студэнцкімі тэатрамі. І даведалася, што ў Англіі практычна ва ўсіх навучальных установах ёсць свае міні-тэатры, а ва універсітэтах студэнты, якія вывучаюць мовы, ставяць на рускай мове творы Л.Талстога, А.Чэхава, М.Астроўскага. Тыя, хто вывучае французскую або італьянскую мову, маюць магчымасць паспрабаваць сябе на сцэнічных падмостках у ролях Журдэна або Пінокіо.

Пасля нашай размовы я задумалася: чаму у нас ва універсітэце, дзе столькі студэнтаў вывучаюць англійскую мову, дзе ёсць дзве кафедры англійскай мовы, а галоўнае, таленавітыя рабяты і жаданне праяўляць сябе ў творчасці, да гэтага часу не з"явіўся такі міні-тэатр, дзе б яны змаглі паспрабаваць свае сілы ў пастаноўцы твораў В.Шэкспіра, Д.Байрана?..

Ідэя стварэння міні-тэатра, які б ставіў п"есы на англійскай мове, была выказана выкладчыкам кафедры англійскай мовы Р.А.Карпавым і студэнтам Д.Малахавым. Трэба адзначыць, што ідэя гэта не новая і не арыгінальная, але гэты тэатр, калі яму суджана з"явіцца на свет, будзе першым англамоўным тэатрам у Беларусі. Будзе крыўдна, калі жаданне студэнтаў праяўляць сябе ў сцэнічных вобразах не знойдзе падтрымкі ў кіраўніцтва нашага універсітэта. Бо са стварэннем такога тэатра ён бы толькі выйграў, калі ўлічыць тое, што ГДУ актыўна развівае міжнародныя кантакты. Тады б было што паказаць гасцям з Англіі, Амерыкі.

Шкада, што ніхто з запрошаных на першы спектакль прадстаўнікоў кіраўніцтва універсітэта і дэканата гісторыка-юрыдычнага факультэта на яго не прыйшоў. Не хацелася б, каб гэты першы спектакль аказаўся і апошнім. А для таго, каб гэтага не здарылася, новаму тэатру неабходна падтрымка.

**А.КАДОЛ,**
**студэнтка 4-га курса гісторыка-юрыдычнага факультэта.**

## ШЧЫРАЕ ДЗЯКУЙ ВАМ, ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ!

Сям'я Уладзіміра Сямёнавіча Дайнэкі, які раптоўна і заўчасна пайшоў з жыцця, выказвае шчырую падзяку кіраўніцтву, выкладчыкам і супрацоўнікам універсітэта за матэрыяльную і маральную падтрымку ў час нашага гора.



ПЕРШЫЯ ВЯСНОВЫЯ КВЕТКІ.

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ

аб"яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:
-- алгебры і геаметрыі -- дацэнта;
-- ВМ і праграміравання -- асістэнта;
-- палітычнай сацыялогіі -- ст. выкладчыка;
-- педагогікі -- ст. выкладчыка;
-- беларускай мовы -- дацэнта;
-- рускай літаратуры -- дацэнта;
-- нямецкай мовы -- выкладчыка;
-- беларускай культуры -- асістэнта;
-- псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі -- ст.выкладчыка (2);
-- тэорыі і методыкі фізічнай культуры -- ст. выкладчыка;
-- факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў -- асістэнта;
-- матэматычных праблем кіравання -- дацэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней I месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат эканамічнага факультэта, калектыў кафедры бухуліку, кантролю і АГД выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку названай кафедры дацэнту **БАБЫНЕ Уладзіміру Піліпавічу** з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **БАЦЬКІ.**

Рэктарат, калектыў факультэта фізічнай культуры выказваюць глыбокае спачуванне ст.выкладчыку кафедры ТМФК **МАКАРЭВІЧУ Уладзіміру Уладзіміравічу** з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **БАЦЬКІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 156
Падпісана да друку 18.04.97.